**Субоцін А. А.**

# КЛІМАТ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVI – ПАЧАТКУ XVII СТ. У АДЛЮСТРАВАННІ БАРКУЛАБАЎСКАГА ЛЕТАПІСУ

У пачатку XXI ст. вывучэнне кліматычных умоў усё больш і больш прыцягвае ўвагу даследчыкаў розных краін свету. Асабліва востра на сённяшні час стаяць пытанні глабальнага пацяплення і змен клімату на планеце. У сувязі з чым праводзяцца разнастайныя канферэнцыі, дзе разглядаюцца прычыны такіх зменаў, сродкі прадухілення далейшага павышэння тэмпературы і праблемы антрапагеннага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. У гэтым плане клімат стаў прадметам даследавання і для гісторыкаў, што знайшло сваё адлюстраванне ў фарміраванні такой навукі, як гістарычная кліматалогія. Прадстаўнікі гістарычнай кліматалогіі імкнуцца прааналізаваць на аснове разнастайных крыніц прыродныя ўмовы існавання чалавека розных эпох і параўнаць гэтыя прыродныя ўмовы з кліматычнымі зменамі сучаснасці. Асаблівую цікавасць для вывучэння гісторыі клімату маюць перыяды Сярэднявечча і Ранняга Новага часу, калі назіраліся кардынальныя змены ў прыродна-кліматычных умовах: перыяды пацяплення змяняліся перыядамі пахаладання і часта мелі месца анамальныя кліматычныя з’явы.

Што датычыцца вывучэння гісторыі клімату Беларусі, то асобныя яго асаблівасці X – пачатку XX стст. былі разгледжаны ў фундаментальных даследаваннях савецкага перыяду, у працах Я. П. Барысенкава і В. М. Пасецкага, дзе ў цэлым была дадзена ацэнка прыродна-кліматычных умоў Усходняй Еўропы праз аналіз пісьмовых крыніц [2, 3]. Айчыннымі ж даследчыкамі, калі не лічыць адзінкавых артыкулаў [1, 4, 6], гістарычныя аспекты кліматычных умоў Беларусі амаль не закраналіся і патрабуюць на сённяшні час цэласнага аналізу іх рэгіянальнай спецыфікі.

Вялікую дапамогу ў асвятленні асаблівасцяў клімату Беларусі можа даць Баркулабаўскі летапіс – помнік беларускага летапісання пачатку XVII ст. Па меркаваннях гісторыкаў, летапіс быў складзены ў мястэчку Баркулабава (сучасны Быхаўскі раён) мясцовым праваслаўным святаром Ф. Філіповічам. У летапісе акрамя звестак пра палітычныя падзеі, гісторыю беларускай культуры і царкоўнага жыцця XVI – пачатку XVII стст. змяшчаецца падрабязнае апісанне з’яў прыроды і фіксіруюцца ўласныя назіранні аўтара пра змены ў надвор’і, якія адзначаліся пераважна на землях Падняпроўя. Пільную ўвагу летапісца да феналагічных апісанняў можна патлумачыць вялікай колькасцю анамальных і незвычайных прыродных з’яў у адзначаны перыяд часу, якія ў цэлым аказвалі негатыўны ўплыў на эканамічны стан Рэчы Паспалітай і паглыбілі яе сацыяльны крызіс. Пры апісанні кліматычных умоў таго ці іншага года аўтар падрабязна разглядае кошты на хлеб і іншыя прадукты земляробства, таксама адзначае час пачатку і заканчэння земляробчых прац. Дадзеныя факты падцвярджаюць думку гісторыкаў пра тое, што аўтар летапісу быў блізкі да народа, яго хваляваў эканамічны стан і паўсядзённае жыццё сялянства.

Першыя згадкі пра клімат у Баркулабаўскім летапісе адносяцца да 1585 г., калі ўстанавілася лютая і марозная зіма. Таксама гэты год быў адзначаны незвычайным летам: на працягу ўсёй пары года назіраліся як спякотнае і сухое надвор’е з вялікай колькасцю маланак і грымот, так і анамальныя маразы, ад чаго загінуў ураджай зерневых, асабліва каля Мінска і Вільні. У тое ж лета, у дзень святых Пятра і Паўла (29 чэрвеня па старым стылі) летапісец адзначаў, што каля Галоўчына быў моцны і вялікі гром, які забіў 12 чалавек, а 3 чалавекі ў выніку прапалі без звестак. Пералічаныя кліматычныя ўмовы прывялі да голаду і мору, а таксама выклікалі міграцыю мясцовых жыхароў ва Украіну [5, с. 177].

Тэндэнцыя кліматычных умоў, якія былі звязаныя з пахаладаннем надвор’я, назіралася і ў наступныя гады. Так, запіс летапісу пад 1586 г. адзначае, што ў дзень святога Юрыя (23 красавіка па старым стылі) выпаў снег па калена, што затрымала ўсе земляробчыя працы. Напрыклад, ячмень і авёс пачалі сеяць толькі ў канцы чэрвеня [5, с. 177]. Вельмі марозная і снежная была зіма 1587 г., за якой пaследавала няўстойлівая па надвор’і вясна, калі рэдкі дзень быў без снегу, які ляжаў аж да пачатку мая. У маі таксама ўсталявалася халоднае надвор’е, а адзін з дзён гэтага месяца быў адзначаны вялікімі дажджамі і шквалістым ветрам. Аўтар Баркулабаўскага летапісу апісвае, што тады градам пабіла шмат пасеваў і нават статкі ў асобных пастухоў. Няўстойлівае надвор’е прывяло да позняга збору ўраджаю: жыта жалі ў пачатку кастрычніка, пасля свята Пакрова Багародзіцы, а авёс з ячменем – праз тры тыдні пасля свята. У цэлым, летапісец характарызуе 1587 г. як вельмі неўраджайны і галодны [5, с. 177].

Такім жа аказаўся і 1588 г., які, акрамя таго, быў адзначаны ўсплёскам эпідэміі, асабліва ў самой сталіцы Вялікага княства Літоўскага – Вільне. У летапісе пра той жа год сцвярджаецца, што 18 студзеня (па старым стылі), на дзень святога Афанасія, “дожди великия были, аж снег согнало, праве было яко не весне: пастухи на бор с статками погналися на паству, а потом за недель три знову зима лютая” [5, с. 178]. Лета 1588 г. было сухім і амаль без ападкаў, а восень наадварот суправаджалася моцнымі дажджамі і вятрамі. У выніку восенню з-за вялікай колькасці дажджоў

Репозиторий ВГУ

адбыліся павадкі, якія залівалі лугі, а Днепр выйшаў з сваіх берагоў. Такое дажджлівае надвор’е працягвалася да Калядаў [5, с. 178].

Пад 1590 г. аўтар Баркулабаўскага летапісу адзначае зіму з моцнымі маразамі і вельмі сухое лета [5, с. 178].

Канец XVI ст. у Беларусі суправаджаўся серыяй анамальных кліматычных з’яў. Так, 11 чэрвеня 1592 г. па ўсходзе Беларусі, у раёне Гомеля, Рэчыцы, Рагачова і Крычава, прайшоў ураган, які суправаджаўся вельмі моцным градам і прычыніў значны ўрон лесу, паламаўшы шмат бортных дрэваў. У той жа год летапісец адзначаў, што яшчэ ў лістападзе дрэвы стаялі з зялёнымі лістамі, як вясной, і засталіся такімі на зіму [5, с. 182]. 1594 г. аказаўся халодным і дажджлівым, а зіму 1595 г. падчас паўстання С. Налівайкі летапісец ахарактарызаваў наступным чынам: “ни зима, ни лето, ни осень, ни весна аж до месяца мая, до святого Афанасия, снегу не было” [5, с. 182–1183]. Зіма 1597 г. была лютая і марозная, а снег ляжаў да канца красавіка. Вясна гэтага ж года суправаджалася вялікімі павадкамі, якія затрымалі пачатак земляробчых прац да сярэдзіны мая. Зіма 1598 г. наадварот была маласнежная і нядоўгая па працягласці [5, с. 184].

Лютай і марознай характарызуецца зіма 1600 г., а восенню таго ж года, 17 верасня, летапіс зафіксаваў моцны гром з вялікай колькасцю маланак і далейшым усталяваннем марознага надвор’я з моцнымі вятрамі. У цэлым, Баркулабаўскі летапіс апісвае 1600 г. як галодны і неўраджайны. Так, на старонках адзначанага твора мы можам чытаць наступнае: “около тысещ 4 з голоду мужей и жон, детей пошло так, иж страшно было видети, иж на улицах, по дорогах, по гумнах, у ровех псы мёртвых многих тела ели” [5, с. 187].

Падрабязна па прыродна-кліматычных характарыстыках у Баркулабаўскім летапісе апісваецца 1601 г. Год характарызаваўся вельмі няўстолівым і халодным надвор’ем летам і познім выспяваннем зерневых культур. Больш таго, восень суправаджалася разнастайнымі кліматычнымі катаклізмамі. Так, напрыклад, летапісец адзначае, што ў канцы верасня частымі былі дажджы з громам, а 4 кастрычніка выпаў вялікі снег, які засыпаў усе пасевы і прычыніў вялікую шкоду збожжу. З 10 кастрычніка цэлы тыдзень ішоў снег з моцным ветрам. Узровень снежнага покрыву летапісец адзначаў “до полголени”. Ад вялікіх маразоў замерз Днепр і па ім ездзілі на санях, як зімой. Такія ўмовы не дазволілі своечасова скончыць земляробчыя працы, і сялянам прыходзілася літаральна з-пад снегу збіраць збожжа [5, с. 187–188]. Зіма 1601 /1602 гг. апісвалася наступным чынам: “того ж року была зима злая, снеги великие и сильные были морозы. Многим людям поморозило кому ногу, кому пальцы, другому вид: уши, нос; а другие з морозу померли” [5, с. 188]. Неспрыяльныя кліматычныя ўмовы і позні збор ураджаю, які аказаўся вельмі нізкім, прывялі да дарагавізны хлеба. Напрыклад, кошты на жыта ў параўнанні з 1599 г. выраслі амаль у 3 разы. Безумоўна, усё гэта прывяло да страшнага голаду па ўсёй Беларусі, пра што Баркулабаўскі летапіс зазначае: “тот наход людей множество почали мерти; по пятеру, по тридцати у яму [хоронили]. Хворых, голодных, пухлых множество, – страх видети гневу божого” [5, с. 188].

Пра наступны 1602 г. летапісец апавядае, што вясна пачалася рана, аднак яна суправаджалася няўстолівым надвор’ем: 13 красавіка на Страсным тыдні назіраўся гром з дажджом і бурай, які змяніўся ў Вялікі чацвер 14 красавіка моцным маразам. Мароз пашкодзіў усе раннія пасевы агародніны, зерневыя культуры і кветкі. Адзначаны год, як і папярэдні, быў небагаты на ўраджай, а цэны на хлеб заставаліся па-ранейшаму вельмі высокімі [5, с. 188].

Аўтар Баркулабаўскага летапісу робіць выснову, што 1600, 1601 і 1602 гг. былі адны з самых неўрадлівых і галодных [5, с. 189], што ў цэлым можна лічыць наступствам кліматычных катаклізмаў, якія назіраліся па ўсёй Усходняй Еўропе таго часу. Так, падобную ж тэндэнцыю мы можам бачыць у суседніх з Беларуссю землях Маскоўскага царства, дзе летам 1602 г. ударыў моцны мароз і загубіў усе пасевы, што прывяло ў 1603 г. да росту цэн на хлеб у 18 разоў у параўнанні з 1601 г. Як сцвярджалі сучаснікі, ад голаду толькі ў адной Маскве загінула 120 тысяч чалавек [3, с. 190].

1603 г. у Беларусі характарызаваўся добрым ураджаем, хаця і вясна тут была вельмі халоднай, а лета было спякотным і сухім, і дождж, згодна з Баркулабаўскім летапісам, назіраўся за ўсё лета толькі тры разы: на дзень Святога Духа, на дзясяты тыдзень ад Вялікадня і на дзень святога Іллі. Снег у 1603 г. выпаў 5 лістапада, а зіма 1603 /1604 гг. апісваецца летапісцам як няўстолівая: снежнае і марознае надвор’е часта змянялася галалёдзіцай і дажджамі з поўным раставаннем снежнага покрыва, што прывяло да разліцця Дняпра і выхаду яго з берагоў [5, с. 189]. Частай зменай надвор’я характарызуецца і вясна 1604 г., калі назіраліся моцныя маразы і вялікая колькасць дажджоў, якія далей працягваліся ўвесь летні перыяд. Дажджлівае надвор’е прывяло да таго, што былі затоплены агароды ў нізінах і на берагах рэк, дзе вада застаялася да канца ліпеня. Гэта ўсё сказалася на нізкім ураджаі зерневых культур, садавіны і агародніны [5, с. 190].

У наступных сваіх апісаннях летапісец вызначае чаргаванне сухіх і вільготных гадоў. Так, зіма 1604 /1605 гг. апісваецца як сухая, марозная і маласнежная, як і ў цэлым вясна і лета 1605 г., калі дажджоў амаль не назіралася. У той жа час 1606 г. характарызуецца надвор’ем з вялікай

колькасцю ападкаў, калі рэкі летам выходзілі з берагоў, як па вясне, што ў выніку не дазволіла нарыхтаваць сялянам сена ў дастатковай колькасці [5, с. 190]. Наступны 1607 г. аказаўся адносна стабільным па сваім надвор'і з сярэднім ураджаем зерневых [5, с. 191]. Апошняе феналагічнае апісанне ў Баркулабаўскім летапісе было зроблена пад 1608 г., калі на працягу ўсяго лета ўсталявалася дажджлівае надвор'е і былі вялікія павадкі [5, с. 192].

Такім чынам, Баркулабаўскі летапіс вельмі падрабязна апісвае прыродна-кліматычныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі і з'яўляецца фундаментальнай крыніцай для правядзення даследаванняў па гістарычнай кліматалогіі. Калі апірацца на апісанні летапісу, то можна зрабіць выснову, што надвор'е на беларускіх землях канца XVI – пачатку XVII стст. характарызавалася наступленнем чарговага пахаладання, што супадала з усталяваннем у Еўропе стадыі Малога ледавіковага перыяду. У абазначаны намі час у Беларусі для большасці гадоў усталявалася халоднае і вільготнае надвор'е з вялікай колькасцю ападкаў, зацяжнымі зімамі і моцнымі вятрамі. З другога боку, гады з вільготным і халодным надвор'ем часта чаргавалася з гадамі, калі назіралася засушлівае лета і маласнежная марозная зіма. Такое няўстойлівае надвор'е прыводзіла да нізкіх ураджаяў, і канец XVI – пачатак XVII стст. часта суправаджаліся голадам, эпідэміямі і морам мясцовага насельніцтва. У цэлым, апісанне Баркулабаўскага летапісу дазваляе нам асэнсаваць сучасныя змены ў клімаце і выявіць іх прычыны, якія могуць быць звязаны не толькі з дзейнасцю чалавека.


1. Аўчыннікава, Р. І. Аналіз кліматычных асаблівасцей на беларускіх землях у перыяд з 1810 па 1813 г. / Р. І. Аўчыннікава // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. / Нац. гіст. архіў Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 10. – С. 115–132.
2. Борисенков, Е. П. Тысячелетняя летопись необычайных явлений природы / Е. П. Борисенков, В. М. Пасецкий. – М. : Мысль, 1988. – 522 с.
3. Борисенков, Е. П. Экстремальные природные явления в русских летописях XI–XVII веков / Е. П. Борисенков, В. М. Пасецкий. – Л. : Гидрометеоиздат, 1983. – 240 с.
4. Дзярновіч, А. І. Клімат і экстрэмальныя з'явы ва Усходняй Еўропе і рэгіёне Паўднёва-Заходняй Беларусі ў II тыс. н. э. (паводле кліматалагічных і пісьмовых крыніц) / А. І. Дзярновіч // Беловежская пуща: история, природа, туризм : материалы междунар. науч. -практ. конф., Каменюки, 18–19 сент. 2009 г. / Нац. парк "Беловежская пуща" ; под науч. ред. А. А. Ковалени, М. Е. Никифорова. – Брест, 2010. – С. 53–58.
5. Полное собрание русских летописей / Институт истории СССР. – М. : Наука, 1975. – Т. 32 : Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. – 233 с.
6. Токць, С. Кліматычныя катаклізмы, голад і эпідэміі ў Беларусі ў 1840–1850-я гг. / С. Токць // Бел. гіст. часопіс. – 2021. – № 1. – С. 3–12.



**Булаты П. Ю.**


## САСЛОЎНЫЯ ТЫТУЛЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПРАЗ ПРЫЗМУ ЎСПАМІНАЎ ФЁДАРА ЕЎЛАШОЎСКАГА

У XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім з нетытулаванага баярства сфарміравалася новая феадальная эліта, якая вылучалася сваёй палітычнай і вайсковай дзейнасцю, актыўным ўдзелам у развіцці культуры і гаспадаркі, валодала буйной маёмасцю [2, с. 59]. У пачатку XVI ст. некаторыя прадстаўнікі пануючай эліты займелі новыя тытулы – князь і граф Святой Рымскай імперыі. Так, акрамя старадаўніх уласных княжацкіх тытулаў у дзяржаве з'явіліся тытулы замежныя.

З'яўленню імперскіх тытулаў у ВКЛ спрыялі міжнародная абстаноўка і знешнепалітычныя стасункі дзяржавы са Святой Рымскай імперыяй. У першай палове XVI ст. іх носьбітамі сталі пяць родаў: Радзівілы, Гаштольды, Іллінічы, Хадкевічы, Тышкевічы. Наданне тытула – высокая ўзнагарода і прызнанне заслуг роду і асобы, тытул надаваўся за вайсковыя, дзяржаўныя, гаспадарчыя справы.

З'яўленне замежных тытулаў адразу выклікала супярэчанні ў грамадстве ВКЛ, што абмяркоўвалася на Берасцейскім сойме 1518 г. Прынящце замежнага тытула ўводзіла новы звычай, які парушаў існуючы лад і роўнасць шляхецкага саслоўя [6, с. 20]. Дазвол на атрыманне тытула павінен быў даць вялікі князь [3, с. 212], што і адбывалася ў выпадку з прадстаўнікамі тытулаваных родаў. Працэс развіцця арыстакратычнай тытулатуры і далейшае яе распаўсюджанне на іншыя заможныя роды быў спынены пасля 1569 г. Адпаведна з прынцыпам шляхецкай роўнасці наяўнасць канкрэтнага тытула не надавала пэўнага прывілеяванага становішча ў грамадстве. Адной з характэрных рыс саслоўнай кансалідацыі і шляхецкай роўнасці з'явілася скасаванне арыстакратычных і спадчынных тытулаў. Выключэннем сталі тыя тытулы, што былі прынятыя раней і дапускаліся Люблінскім соймам [1, с. 45].

З кропкі погляду бюракратычнай сістэмы ВКЛ – замежныя тытулы сталі фармальнасцю, яны не надавалі іх носьбітам сацыяльных пераваг. Іншы бок сітуацыі: як саслоўныя тытулы ўспрымаліся грамадствам і як яны адлюстроўваліся ў свядомасці сучаснікаў, якім чынам яны трансліраваліся і ўжываліся? Дадзены момант можна прасачыць праз мемуарную літаратуру.

Рэпазіторый ВДУ